Тэатр

ФАРМАТ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ

Чым парадаваў VII рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі

За шэсць дзён лістапада 11 тэатраў з Беларусі, Расіі, Украіны і Грузіі паказалі на бабруйскай сцэне 12 спектакляў. А калі быць дакладным, то ўсе 15, бо некаторыя пастаноўкі гледачы ўбачылі двойчы. Асаблівасць фестывалю ў тым, што на ім прадстаўлены выключна творы беларускіх драматургаў — і вельмі радуе, што яны блізкія не толькі беларусам. Было цікава ўбачыць інтэрпрэтацыю п'есы маладой аўтаркі Марыі Іванюшэнкі «Ты знойдзеш Алісу пад старым снегам» у выкананні грузінскага тэатра. А твор Паўла Пражко «Два пярсцёнкі» ў прачытанні гасцей з Санкт-Пецярбурга так уразіў тэатразнаўцаў, што некаторыя назвалі яго адкрыццём фестывалю.

Фота БелТА.

— Гэта вопыт візуальнага тэатра, звязанага з вялікім уплывам музыкі. Такога яшчэ не было, гэта цалкам эксперыментальная работа. Цікава, як працуе акцёр, як выбудоўваюцца ўзаемаадносіны ў такім тэатры, дзе няма дыялогу і слоў, — падзялілася ўражаннямі **загадчык аддзела тэатральнага мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вераніка ЯРМАЛІНСКАЯ.** Яна неаднаразова прысутнічала на фестывалі як крытык, а сёлета ўпершыню ўзначаліла журы.

Наогул сёлетняя афіша была вельмі насычаная і разнастайная. На ўдзел у форуме было пададзена 27 заявак, але ў праграму ўвайшло толькі 12 спектакляў. Але і гэта таксама рэкорд. «Фестываль быў больш насычаны спектаклямі, чым папярэднія, з'явілія новыя госці, — адзначыла Вераніка Ярмалінская. — Гэтым разам было больш эксперыментальных работ, новых формаў: гэта і Павел Пражко з яго «Двума пярсцёнкамі», і вельмі папулярны сёння Канстанцін Сцешык, «Ляцелі арэлі» якога паказаў гомельскі тэатр, і модны драматург Дзмітрый Багаслаўскі».

Эксперты адзначылі ўкраінскі «варыянт» спектакля «Тата, ты мяне любіў?» Дзмітрыя Багаслаўскага ад Кіеўскага акадэмічнага тэатра «Залатыя вароты»: прыгожая сцэнічная мова, высокі ўзровень школы акцёрскага мастацтва. Пастаноўка, дарэчы, стала сёлета фаварытам, атрымаўшы ўзнагароду ў намінацыі «Найлепшы спектакль». Для драматурга Багаслаўскага фестываль наогул быў зорны, бо ягоны твор «Ціхі шоргат адыходзячых крокаў» назвалі найлепшай п'есай сучаснага беларускага аўтара.

Акцёра Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра Дзмітрыя Попчанку, які сыграў Стаса ў спектаклі «Ляцелі арэлі» *(на фота)*, прызналі пераможцам у намінацыі «Найлепшая мужчынская роля». Узнагарода за найлепшую жаночую ролю дасталася Ганне Семяняцы — яе Дзіна са спектакля «Сірожа» была непараўнальная. За найлепшыя ролі другога плана ўзнагародзілі Аляксандра Ярэму (спектакль «Тата, ты мяне любіў?») і Лізу Астрахову (спектакль «Ляцелі арэлі»). Вердыкт «Найлепшая рэжысура» атрымаў спектакль «Сірожа» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. А найлепшая сцэнаграфія, на думку журы, была ў спектакля «Сіртакі» Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча.

Тое, што ў беларускай драматургіі ёсць будучае, тэатразнаўцы не сумняваюцца.

— З'яўляюцца новыя п'есы, новыя імёны. Юлія Чарняўская, напрыклад, — рэзюмуе старшыня журы. — Яна педагог, выкладае ва ўніверсітэце, а паралельна піша п'есы, якія запатрабаваныя ў тэатрах. Мы ж ведаем, што сёння вельмі складана трапіць на сцэну, трэба, каб рэжысёр аддаў перавагу менавіта твайму твору. А сёння пайшла такая тэндэнцыя, што рэжысёры самі шмат ствараюць п'ес і шмат займаюцца інсцэніроўкамі.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СМАК КОЛЕРАЎ У ЮБІЛЕЙНЫМ СВЯТЛЕ

Час, калі Нацыянальны мастацкі музей адзначае свой 80-ы дзень нараджэння, асабліва плённы для наведвальнікаў: адметныя праекты, сустрэчы ды нават падарункі. Іх музей не кладзе на паліцы ў сховішчах, а прадстаўляе гледачу.

Напрыклад, напярэдадні свята падарункі склалі экспазіцыю «Прашу прыняць у дар...», дзе выстаўленыя самыя значныя экспанаты, атрыманыя ў апошнія дзесяцігоддзі. За апошнія 20 гадоў музейную калекцыю папоўнілі 4972 падарункі.

І літаральна днямі калекцыя зноў папоўнілася каштоўнасцямі для нацыянальнай культуры: дзякуючы ганаровaму консулу Рэспублікі Беларусь у Лазане Андрэю Нажэскіну наша краіна цяпер мае яшчэ тры карціны нашага знакамітага земляка Фердынанда Рушчыца. Дагэтуль у музеі быў адзін яго твор — з больш чым 30 тысяч экспанатаў. Аснову калекцыі музея, гісторыя якога пачыналася ў 1939 годзе з заснавання Дзяржаўнай карціннай галерэі, заклала Алена Аладава, апантаны дырэктар, якая ўзначаліла ўстанову ўжо пасля вайны. Дзякуючы ёй, у прыватнасці, у Беларусі ёсць творы знакамітых рускіх мастакоў. Частка самых адметных работ уключана ў пастаянную экспазіцыю. А шэраг твораў, якія даюць магчымасць атрымаць уяўленне пра пэўны пласт мастацтва, дэманструюцца на адмысловых выстаўках. Адна з такіх — «Рускі імпрэсіянізм», што праходзіць зараз.

Колеравыя ўсплёскі, праз якія праступае не столькі жыццё, колькі яго адчуванне, ды няпэўнасць ліній, за якой стаіць упэўненасць аўтараў у абраным кірунку — тое, што прымушае верыць у магчымасць чыстага мастацтва і праз 100 гадоў пасля таго, як былі створаныя гэтыя работы. Але ёсць яшчэ адно, чым кранае гэта выстаўка: дае падставу перагледзець уласныя адносіны да рускага мастацтва мяжы XIX—XX стагоддзяў, адысці ад стэрэатыпнага погляду, абумоўленага ведамі пра неўміручы рэалізм. Прытым што пад увагай мастакоў-імпрэсіяністаў (якія стаялі ля вытокаў гэтай плыні) была ўсё ж рэчаіснасць. Але ж погляд на яе і выніковае адчуванне моманту выклікалі настолькі моцныя эмоцыі, што кірунак, які ўразіў Парыж у прыканцы XIX стагоддзя, аказаўся даволі плённы і перайшоў межы эпох і краін.

...Рускі мастак Канстанцін Каровін быў захоплены Парыжам і любіў яго адлюстроўваць — розным, у розныя часы дня, з розным настроем, адчуваннем. Вучань Аляксея Саўрасава і Васілія Паленава, ён імкнуўся да творчай адметнасці, што яму не маглі дараваць настаўнікі, адданыя акадэмізму. А ён толькі больш умацоўваўся ў жаданні быць іншым, магчыма, калі прыслухоўваўся да сваіх адчуванняў у розных вандроўках. Але Парыж стане для яго горадам-марай, горадам-лёсам: ці прадчуваў Каровін, што тут яму выпадзе памерці ў 1939 годзе, амаль у галечы?.. Але не хочацца думаць пра гэта, калі глядзіш яго «Вечаровы Парыж» — ён вабіць і натхняе на вірлівае жыццё. Гэты твор знаходзіцца ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, як і яшчэ больш за дзясятак работ майстра.

І не толькі яго. Сярод тых, каго можна назваць рускімі імпрэсіяністамі, — шэраг імёнаў, якія шмат для каго могуць стаць персанальнымі адкрыццямі. Сяргей Вінаградаў, Абрам Архіпаў, Аляксандр Мараваў, Леанід Туржанскі, нават Валянцін Сяроў ды іншыя ствараліў імпрэсіяналістычнай манеры. Уплыў імпрэсіянізму быў настолькі моцны, што не абмінулі яго сваімі прыхільнасцямі некаторыя савецкія мастакі, праўда, умела хавалі свае «фармальныя» пошукі ў час панавання «правільных» поглядаў. Аднак імпрэсіянізм аказаўся непераможны і ўсё роўна прабіваўся праз рэалістычны погляд на жыццё. Як таленавіта гэта можна было рабіць, сведчыць выстаўка, дзе назіраеш асоб у мастацтве, якіх не здолела перамагчы рэчаіснасць.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Калі Парыж ідзе да вас

Дачны сезон закончыўся, але гэта не падстава сядзець дома. Сумныя вечары можна правесці ў прыемнай кампаніі за кубачкам гарбаты і адначасова далучыцца да мастацтва. Галерэя імя Вашчанкі ў Гомелі распачала сезон камерных сустрэч пад назвай «Утульны вечар».

— Людзям сёння не хапае цёплай атмасферы, — гаворыць **дырэктар галерэі Людміла ШЫМБАЛЁВА.** — Яны прыходзяць паглядзець выстаўку, але ім недастаткова толькі паслухаць экскурсавода, ім важна абмеркаваць паміж сабой уражанні, пачуцці, атрымаць нейкую новую інфармацыю...

Яе і падрыхтаваў для гасцей галоўны захавальнік фондаў Алег Курашоў. Ён правёў прэзентацыю, прысвечаную мастацкім традыцыям сталіцы Францыі пачатку мінулага стагоддзя. Чаму Парыж, спытаеце вы? Таму, што тэма суадносіцца з выстаўкай, якая цяпер размешчана ў залах галерэі. Тут, дарэчы, упершыню ў Беларусі экспануецца калекцыя літаграфій «Параграфы» Пабла Пікаса. У праект увайшла 61 работа з прыватных збораў Германіі, Бельгіі і Францыі.

Адна з залаў прысвечана знакаваму твору іспанска-французскага мастака. Экспрэсіўнае палатно «Герніка» было напісана ў 1937 годзе. Яно стала публічным пратэстам супраць бамбардзіроўкі нацыстамі басконскага горада Гернікі. Арыгінал карціны знаходзіцца ў Мадрыдзе, а вось малюнкі для знакамітай работы можна пабачыць у гомельскай галерэі зараз. На выстаўцы прадстаўлены ўвесь шлях стварэння гэтай вострай сацыяльна-палітычнай карціны ў 37 эскізах.

Дарэчы, цікава пазнаёміцца з раннімі работамі агульнавядомага майстра. Яны напісаны ў час, калі Пікаса жыў на два гарады: у Барселоне і ў Парыжы. Яго работы прасякнуты рознакаляровасцю жыцця французскай сталіцы, а любімымі матывамі становяцца малюнкі закаханых парачак, сцэн у кафэ і кабарэ, — расказвае **старшы захавальнік фондаў гомельскай мастацкай галерэі імя Гаўрыіла Вашчанкі Таццяна БАРЫСАВА**: — У гэту ж серыю ўваходзяць работы блакітнага перыяду, калі юны Пікаса перажываў смерць блізкага сябра — мастака Карласа Касагемаса, які скончыў жыццё самагубствам. Менавіта ў той час шматкаляровая гама змяняецца на цёмна-сінюю і шэра-блакітную — адценні смутку і адзіноты. Частымі сюжэтамі ў той час становяцца малюнкі адзінокіх жанчын і мужчын, маці з дзецьмі, вар'ятаў, старых.

Серыя «Пап'е-Кале» дэманструе грані аналітычнага і сінтэтычнага кубізму. Вядомая карціна Пабла Пікаса «Авіньёнскія дзяўчаты» ў свой час выклікала ў грамадстве культурны шок і абурэнне. Менавіта такая бурная рэакцыя, якую сёння назвалі б хайпам, надала мастаку ўпэўненасці. Ён дакладна зразумеў, што трэба працягваць маляваць менавіта ў гэтым кірунку.

Дарэчы, як без жанчын. Іх партрэты, прадстаўленыя на выстаўцы, выкананы Пікаса ў самых розных тэхніках — ад рэалізму да кубізму. Пра муз французскіх мастакоў размова ідзе і падчас утульнага вечара, які суправаджаецца жывой музыкай і песнямі Эдзіт Піяф.

— Мы плануем праводзіць такія вечарыны раз у месяц, — запэўнівае дырэктар галерэі Людміла Шымбалёва. — Далей будуць Тулуз-Латрэк, потым Маціс, Ван Гог... Менавіта экспазіцыі карцін гэтых французскіх мастакоў запланавана прывезці ў Гомель. Нам важна атрымаць адваротную сувязь ад людзей, таму мы будзем працягваць праводзіць такія вечарыны. Наша задача — падцягнуць людзей да мастацтва праз цікавыя інтэрактыўныя праекты.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.